# КОНКУРС
# “БЕЛАРУСЫ ЛАТВІІ. МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ”

## “Беларуская гісторыя і культура ў Латвіі”

# “Гісторыка-культурны феномен газеты беларусаў Латвіі “Прамень”

Аўтар даследчай работы:
**Зелянко Сяргей Віктаравіч**,
дацэнт кафедры стылістыкі і
літаратурнага рэдагавання
Інстытута журналістыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
Рэспубліка Беларусь, г. Мінск,

**2016**

# СПІС ПРЫНЯТЫХ АБАЗНАЧЭННЯЎ І СКАРАЧЭННЯЎ

адс. – адсутнічае (нумар газеты адсутнічае)

г. – год

і г.д. – і гэтак далей

і інш. – і іншыя

каляр. – каляровы (у нумары прысутнічаюць паўнакаляровыя ілюстрацыі)

кол. – колер (у нумары прысутнічаюць двухколерныя ілюстрацыі)

не пазн. – не пазначаецца (тыраж не пазначаецца)

С./с. – старонка(кі)

СМІ – сродкі масавай інфармацыі

СМІК – сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі

СМК – сродкі масавай камунікацыі

спалуч. – спалучаны (спалучаныя нумары газеты)

ч/б – чорна-белы

# УВОДЗІНЫ

Паміж Рэспублікай Беларусь і Латвійскай Рэспублікай на сёння існуюць наладжаныя, даволі працяглыя добрасуседскія адносіны, якія абумоўліваюцца, можна так меркаваць, некалькімі ўзаемазвязанымі фактарамі: па-першае, агульнай гістарычнай спадчынай нашых дзяржаў, па-другое, геаграфічным становішчам краін (наяўнасцю агульнай мяжы), па-трэцяе, блізкасцю культур нашых народаў.

Англійскі літаратуразнаўца, прафесар Арнольд МакМілін у манаграфічнай працы “Belarusian literature of the diaspora” слушна адзначае: “Афіцыйныя беларускія ўзаемаадносіны з Латвіяй сягаюць у 1921 г., калі была заснавана ў Даўгаўпілсе арганізацыя “Бацькаўшчына”. Праз тры гады была заснавана Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), якая праіснавала кароткі час. І добрыя адносіны паміж дзвюма краінамі працягваюцца да сёння” [21, р. 239]. Безумоўна, нельга не пагадзіцца з апошнім тэзісам паважанага даследчыка.

На тэрыторыі Латвійскай Рэспублікі ў адпаведнасці з перапісам насельніцтва, які быў праведзены ў 2011 г., стала пражывае больш за 68 000 этнічных беларусаў (3,4 % ад агульнай колькасці жыхароў). Гэта другая па велічыні дыяспара ў краіне пасля рускіх, якіх больш за 550 000 чалавек (26,9 % ад агульнай колькасці жыхароў) [гл. 11].

Па звестках на студзень 2014 г. у Латвійскай Рэспубліцы пражывае 74 205 беларусаў [гл. 12].

Беларусы ў Латвіі даволі актыўна займаюцца бізнесам, грамадскай, культурна-асветніцкай і адукацыйнай дзейнасцю. Напрыклад, пад старшынствам спадарыні Валянціны Піскуновай паспяхова працуюць Саюз беларусаў Латвіі [гл. 1] і Асацыяцыя прадпрымальнікаў-беларусаў у Латвіі “Беларускі шлях”. Акрамя таго ў Латвіі дзейнічае аб’яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі “Маю гонар”; функцыянуюць іншыя грамадскія аб’яднанні – Беларускае таварыства “Прамень”, Даугаўпілскае беларускае культурна-асветніцкае таварыства “Уздым”, Рэзекненскае беларускае таварыства “Сузор’е”, Вентспілскае беларускае таварыства “Спадчына”, Ліепайская беларуская абшчына “Мара”, Беларускае культурнае таварыства “Вясёлка”, Лудзенскае беларускае таварыства “Крыніца”, Елгаўскае беларускае таварыства “Лянок”, Екабпілскае беларускае таварыства “Спатканне”, Беларускае таварыства “Сябры”, Дагдскае беларускае таварыства “Вербіца”, Беларускае таварыства “Пралеска”, Елгаўскае беларускае таварыства “Злата” і інш [гл. 14]. У Рызе пад кіраўніцтвам Ганны Іванэ працуе беларуская асноўная школа, якая носіць імя нашага слыннага песняра – Янкі Купалы [гл. 8]. На Латвійскім Радыё 4 транслююцца перадачы, прысвечаныя жыццядзейнасці нашых суайчыннікаў у Латвійскай Рэспубліцы [гл. 10].

Як бачна, беларусы Латвіі вельмі арганічна ўключаны ва ўсе сферы жыцця краіны. Аднак, на наш погляд, адным з найадметнейшых праектаў суайчыннікаў у Латвійскай Рэспубліцы з’яўляецца стварэнне і наладжаны выпуск друкаванага СМІ.

Больш за дваццаць (!!!) гадоў выходзіць у свет выданне “Прамень” – газета беларусаў Латвіі, адно з нешматлікіх беларускіх перыядычных выданняў, што выпускаецца па-за межамі Рэспублікі Беларусь нерэзідэнтамі нашай краіны. Менавіта гэтым абгрунтоўваецца **актуальнасць тэмы** даследавання, якая вынікае з неабходнасці ўсебаковага навуковага вывучэння паспяховага

вопыту дзейнасці газеты беларусаў Латвіі "Прамень" на працягу больш як 20 гадоў, яго асэнсавання і далейшай інтэрпрэтацыі.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляецца ўласна перыядычнае выданне – нумары газеты беларусаў Латвіі "Прамень", якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па стане на кастрычнік 2016 г. (усяго 109 нумароў газеты). **Прадметам** вывучэння і апісання ў даследаванні выступае кантэнт паданалізнага выдання.

Для дасягнення пастаўленай мэты вырашаўся шэраг наступных агульных і прыватных **задач**:

**выявіць** наяўнасць/адсутнасць у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі газеты беларусаў Латвіі "Прамень";

**зрабіць** аналітычнае апісанне кантэнту газеты беларусаў Латвіі "Прамень" на розных гістарычных этапах існавання выдання (з 1994 г. па 2016 г.);

**апісаць** асаблівыя прыкметы зместу паданалізнага СМІіК у параўнальным аспекце;

**вызначыць** тэматычныя прыярытэты рэдкалегіі газеты на працягу 22 гадоў існавання выдання;

**правесці** комплексны аналіз мастацкага афармлення выдання ў перыяд з 1994 г. па 2016 г.;

**кваліфікаваць** асноўныя заканамернасці і шляхі развіцця газеты беларусаў Латвіі "Прамень" на сучасным этапе.

Пералічаныя агульныя і прыватныя задачы былі пастаўлены і вырашаліся на розных этапах выканання работы.

Асаблівасці прыроды, а таксама спецыфіка аб'екта і прадмета навуковага даследавання прадвызначылі **метадалогію** і сукупнасць **метадаў** комплекснага і сістэмнага аналізу. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся: мета-аналіз, кантэнт-аналіз, дыскурсны аналіз, параўнальны аналіз (у сінхраніі і дыяхраніі), апісальны, частотна-статыстычны і кампанентнага аналізу метады, а таксама была праведзена трыянгуляцыя методык.

**Практычная значнасць** даследавання заключаецца, па-першае, у магчымасці выкарыстання зробленых вывадаў і абагульненняў у практычнай дзейнасці рэдкалегіі і творчых супрацоўнікаў (журналістаў, дызайнераў, фатографаў) менавіта самой газеты "Прамень" шляхам карэкцыі альбо ўдасканалення некаторых аспектаў рэдакцыйна-выдавецкай палітыкі; па-другое, у магчымасці ўключэння ў практычныя курсы па гісторыі замежнай і айчыннай журналістыкі, якія чытаюцца ў Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, звестак пра газету беларусаў Латвіі "Прамень"; па-трэцяе, у пашырэнні эмпірычнай базы навуковых даследаванняў супрацоўнікаў і студэнтаў Інстытута журналістыкі БДУ за кошт уключэння ў яе склад і паданалізнага выдання, нарэшце, па-чацвёртае, у выданні асобнай манаграфічнай навукова-метадычнай працы "Гісторыка-культурны феномен газеты беларусаў латвіі "Прамень"" з апісаннем шляхоў развіцца і станаўлення выдання, яго генезісу і анталогіі, грунтоўным аналізам асаблівасцяў жанрава-зместавага напаўнення газеты, прагнозам яе далейшага функцыянавання ў сучасных умовах інфармацыйнага грамадства і пашырэння ІТ-тэхналогій.

# МІСІЯ ГАЗЕТЫ БЕЛАРУСАЎ ЛАТВІІ “ПРАМЕНЬ”: ЯЕ ДЗЕЙНАСЦІ І ПЕСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦА

Як ужо было адзначана, газета беларусаў Латвіі “Прамень” была заснавана ў 1994 г. У гэтым жа годзе, 27 снежня, пабачыў свет і першы нумар выдання. На першай паласе першага нумара новай газеты рэдакцыйная калегія выдання змясціла зварот “Да беларусаў Латвіі”, у якім адзначалася: “Паважаныя суайчыннікі! Сёння вы трымаеце ў руках і здзіўлена разглядаеце першы нумар газеты “Прамень”, надрукаваны на нашай роднай беларускай мове <...> Нават у далечыні ад сваёй Радзімы, праз блізкую па напрамку і адлегласці газету вы нараўне са сваімі сародзічамі прымеце ўдзел у агульнай справе адраджэння беларускіх святыняў – мовы, культуры, гісторыі, развіцця на гэтай аснове добрых і цесных узаемаадносін паміж беларускім і латышскім народамі” [5, с. 1]. Як бачна, рэдкалегія ставіла перад сабой і перад сваёй чытацкай аўдыторыяй вельмі нялёгкую задачу. І задачу гэту, як паказвае праведзены намі дыскурсны аналіз больш як дваццацігадовай гісторыі існавання выдання, а таксама Саюза беларусаў Латвіі, заснавальнікі і выдаўцы газеты “Прамень” не проста паспяхова выканалі, а працягваюць выконваць і даказваць кожным днём сваёй высакароднай працы на гэтай ніве. У гэтым рэчышчы трэба адзначыць, што вельмі дзіўным выглядае факт адсутнасці звестак пра газету беларусаў Латвіі “Прамень” у грунтоўных бібліяграфіях “Belarusian publishing in the West” [гл. 20], “Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе” [гл. 3] і “Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе” [гл. 4]. Наша даследаванне пэўным чынам павінна выправіць гэтую недарэчнасць і пасадзейнічаць навуковаму асэнсаванню шматгадовага вопыту выдання беларускай газеты па-за межамі Рэспублікі Беларусь.

Адна з найвыбітных асоб беларускай суполкі ў Латвійскай Рэспубліцы, старшыня Саюза беларусаў Латвіі, спадарыня Валянціна Піскунова, у сваёй праграмнай прамове на Першай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Латвія – Беларусь: дыялог двух культур” слушна падкрэслівала: “З 1994 года суполкай “Прамень” рэгулярна выдаецца газета беларусаў Латвіі “Прамень” (галоўны рэдактар Лявон Шакавец, старэйшы беларускі журналіст у Латвіі) <...> На старонках газеты шырока асвятляюцца арганізацыйна-культурныя мерапрыемствы, якія ладзяцца беларускімі таварыствамі Латвіі. Гэта садзейнічае не толькі інфармаванню, а і выхаваўчаму станаўленню нацыянальнай самасвядомасці шырокіх слаёў беларускай грамадскасці, павышэнню іх інтарэса да нацыянальнай культуры, роднай мовы і др. напрамкаў беларускай духоўнай спадчыны, жаданню самім уліваецца ў суполкі і творчыя калектывы пры іх” [13, с. 111].

Сапраўды, як паказвае праведзены кантэнт-аналіз у сінхранічным і дыяхранічным дыяпазонах усіх нумароў газеты беларусаў Латвіі “Прамень”, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (гл. Дадатак 1), культурны складнік у тэматычным напаўненні выдання з’яўляецца дамінуючым. Прыкладна 60-80 % апублікаваных матэрыялаў амаль у кожным нумары прысвечана пытанням культуры і мастацтва, мовы і адукацыі, а таксама

гістарычнай спадчыне Беларусі. Для пацверджання апошняга тэзісу прывядзем некалькі назваў адмысловых рубрык, што стала замацаваліся ў паданалізным выданні, якія былі абраны метадам спантаннай выбаркі з усяго масіву даволі аб’ёмістага эмпірычнага матэрыялу: *“Гісторыя Бацькаўшчыны”*, *“Беларускі гумар”*, *“Нашы знакамітыя землякі”*, *“Беларуская старасветчына”*, *“Спадчына нашых дзядоў”, “Беларускія народныя абрады”*.

Такую ж тэндэнцыю ўхілу ў гісторыка-культурную тэматыку назіраем і ў загаловачных комплесах большасці матэрыялаў выдання. Гэты тычыцца і невялічкіх інфармацыйных нататак-паведамленняў, і грутоўных аналітычных артыкулаў аб праблемах захавання нашай спадчыны, і рэпартажаў з фестываляў і конкурсаў, і інтэрв’ю з дзеячамі беларускай культуры: *“Прафесіі даўніны”*, *“600 гадоў на Беларусі”*, *“Ён быў ваяводам, старастам, вялікім канцлерам”*, *“Беларуская зорка ў небе Чылі”*,*“Беларускія формы прозвішчаў і іх перадача на іншыя мовы”*,*“Аб Айчыне нашай васільковай – Беларусі”*, *“За рэцэптам – да продкаў”*,*“Імем Чэрскага названы горад, краж, гара, даліна...”* і г.д.

Увогуле на старонках выдання за ўсю гісторыю яго паспяховай працы праведзены кантэнт-аналіз дазволіў выявіць наяўнасць матэрыялаў амаль усіх журналісцкіх жанраў, якія вылучаюць даследчыкі тэорыі медыя [гл. 15]. Гэта і публікацыі інфармацыйных жанраў (нататкі, замалёўкі, інтэрв’ю, справаздачы, агляды, рэпартажы), і аналітычных (карэспандэнцыі, артыкулы, рэцэнзіі, агляды), і мастацка-публіцыстычных (нарысы, фельетоны). Гэты факт сведчыць пра вельмі сур’ёзнае і прафесійнае стаўленне рэдакцыйнай калегіі газеты да разнастайвання жанравай палітры выдання для пашырэння цікавасных кругаглядаў і задавальнення розных густавых пераваг кожнага прадстаўніка сваёй чытацкай аўдыторыі.

Трэба адзначыць, што асаблівую ўвагу звяртаюць на сябе навукова-папулярныя і публіцыстычныя артыкулы Лявона Шакаўца, прысвечаныя пытанням папулярызацыі беларускай культуры і роднай мовы на старонках выдання і, адпаведна, у рэальным жыцці чытачоў. Гэта артыкулы – *“Вывучаем родную мову”*, *“Як будзе па-беларуску...”*, *“Мова – тая ж чыстая крыніца”*, *“Крамольныя нататкі – мова і кілбаса”* і інш. Галоўны рэдактар газеты адзначае: “Культура – гэта той сродак, які прыносіць вялікі прыплод і ў нашы дні. Яна становіцца галоўнай тэмай газеты беларусаў Латвіі “Прамень” <…> Мы – рэдкалегія, аўтары трымаліся думкі, што менавіта культура аказвае ўплыў на стан дыяспары, фарміруе спрыяльнае жыццёвае асяроддзе, у якім мы жывем” [17, с. 107]. Гэты тэзіс стаў праграмным у прафесійнай дзейнасці супрацоўнікаў газеты больш як на 2 дзесяцігоддзі.

Падобная тэндэнцыя да фарміравання кантэнту друкаванага выдання прасочваецца, як сцвярджаюць навукоўцы, у большасці газет і часопісаў, інфармацыйных лісткоў і бюлетэняў, што выдаваліся нашымі суайчыннікамі за межамі Бацькаўшчыны, паколькі “перыядычныя выданні непасрэдна ўздзейнічалі на працэсы нацыянальнага самавызначэння беларусаў у прымаючым грамадстве, спрыялі абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці дыяспары, зберажэнню нацыянальнай ідэнтычнасці. Інфармацыя са старонак газет і часопісаў дапамагала фарміраваць этнічнае самаадчуванне беларускай

супольнасці замежжа, яе этнічную асаблівасць” [9, с. 239]. Родная мова, агульная культурная прыналежнасць мацуюць грамадства, асабліва гэта тычыцца нацыянальных суполак, якія знаходзяцца па-за межамі Бацькаўшчыны ва ўмовах чужога маўленчага асяроддзя.

Аднак жыццё ў іншай краіне вымагае ад суайчыннікаў і абавязковай інтэграцыі ў грамадства, якое прыняло іх у сваёй нацыйнальна-культурнай прасторы, хоць і блізкай, хоць і роднаснай, але не роднай. Прафесійную інфармацыйную дапамогу ў гэтым беларусам Латвіі без перабольшвання аказвала і аказвае газета “Прамень”. Гэта адзначаюць і беларускія калегі-журналісты. Так, у матэрыяле “Душэўны летапіс жыцця” Івана Ждановіча, супрацоўніка газеты “Голас Радзімы”, чытаем: “Па-ранейшаму на 22-м годзе выдання застаецца вельмі важным інструментам у грамадскай працы супляменнікаў і газета беларусаў Латвіі “Прамень”” [6, с. 2].

Менавіта на старонках газеты “Прамень” беларусы, якія стала пражываюць у Латвіі альбо наведалі яе з кароткатэрміновым візітам, заўсёды знаходзілі самыя свежыя навіны і аператыўныя абвесткі пра афіцыйныя ўзаемаадносіны дзвюх краін-суседак – Рэспублікі Беларусь і Латвійскай Рэспублікі, артыкулы пра жыццё беларусаў у Латвіі, пра яе культуру і гісторыю, пра важкі ўнёсак у яе гісторыка-культурную скарбонку найлепшых прадстаўнікоў беларускай дыяспары Латвіі.

Наступныя загаловачныя комплексы публіцыстычных матэрыялаў, якія былі апублікаваны ў газеце “Прамень” за больш як дваццацігадовы перыяд (з 1994 па 2016 гг.) і вылучаны для аналіза метадам спантаннай выбаркі, пацвярджаюць выказаную раней думку: *“Сувязь латышскіх і беларускіх пісьменнікаў”*, *“Рыжскі трыумф віцебскіх мастакоў”*, *“Латышскія выданні пра беларусаў”*, *“У Рызе адбыўся вечар беларускай паэзіі”*, *“Праблемам беларусаў – дзяржаўнае вырашэнне”*, *“Гісторыя газеты – гэта гісторыя беларускай дыяспары ў Латвіі”*, *“Беларуская восень прыйшла ў Елгаву”*, *“А хто там ідзе? – Беларусы Латвіі”*, *“Лікаванне праваслаўных Латвіі”*, *“За адукацыяй на этнічную Радзіму”*, *“Знаёмства з мастацтвам Латвіі”*, *“Дыпламатычнаму ведамству Беларусі ў Даўгаўпілсе – 10 гадоў”*, *“Супрацоўніцтва з Урадам Латвіі”*, *“Беларуская асвета ў Латвіі”*, *“Беларусы ў Латгаліі: гісторыя і лічбы”* і інш. Як яскрава сведчаць прыведзеныя вышэй прыклады, і ў значнай частцы журналісцкіх тэкстаў, у першую чаргу накіраваных на аператыўнае і ўсебаковае інфармаванне беларускай суполкі ў Латвійскай Рэспубліцы пра падзеі ўнутры краіны іх пражывання ці ў суседніх дзяржавах (асабліва гэта тычыцца рэпартажаў і вялікіх аналітычных артыкулаў), прэвалюе вельмі моцны гісторыка-культурны тэматычны складнік, абумоўлены галоўным чынам нацыянальнымі цікавасцямі чытацкай аўдыторыі газеты “Прамень” [гл. 16].

Аднак, як выразна дэманструюць вынікі праведзенага кантэнт-аналіза, паступова газета беларусаў Латвіі “Прамень” з вузкафарматнага выдання, большасць матэрыялаў якога была прысвечана выключна пытанням са сферы культуры, ператварылася ў сапраўдную грамадска-палітычную газету з адпаведным тэматычным і жанравым напаўненнем.

Апошні тэзіс тлумачыцца тым фактам, што не пераставалі нашы суайчыннікі ў Латвіі ўважліва сачыць і за афіцыйнымі навінамі з Бацькаўшчыны, у чым зноў жа ім дапамагаў “Прамень”. На старонках гэтага сродку масавай інфармацыі на працягу яго больш як дваццацігадовай гісторыі друкаваліся матэрыялы, якія асвятлалі ўнутраную і знешнюю палітыку Рэспублікі Беларусь. Адзначым, што пры гэтым рэдкалегія не абмяжоўвалася выключна звесткамі пра ўзаемадзеянне кіраўніцтва Беларусі і Латвіі, тэматычнае поле падобных медыятэкстаў было і застаецца значна шырэйшым. Пацвердзім сказанае прыкладамі – назвамі публіцыстычных артыкулаў (пераважна інфармацыйных і аналітычных), якія друкаваліся ў газеце “Прамень” на працягу яе функцыянавання: *“9 верасня выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь”*, *“Заява Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусь”*, *“Беларусь за 10 гадоў: Дасягненні і перспектывы”*, *“Беларусь і далей будзе жыць сваім розумам і паступаць па сваіх законах”*, *“За адзінства нацыі! За дабрабыт! За росквіт Беларусі!”*, *“Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка зацвердзіў новую структуру Урада і новы Прэзідыум Савета міністраў”*, *“Беларускі міністр у Рызе”*, *“Паездка беларускага віцэ-прэм’ера ў Вентспілс”*, *“Сустрэча з Прэм’ер-міністрам Рэспублікі Беларусь”*, *“Супрацоўніцтва з Урадам Латвіі”*, *“Грамадзяне Літвы хочуць добрых адносінаў з Беларуссю”*, *“Жыццё беларусаў у Латвіі і іншых замежных краінах”* і інш.

Пэўныя тэматычныя лакуны на сваіх старонках пра падзеі ў свеце, як гэта і прынята ў журналісцкім прафесійным асяроддзі, газета беларусаў Латвіі “Прамень”, у першую чаргу, кіруючыся патрэбамі сваёй чытацкай аўдыторыі ў аператыўным і політэматычным інфармаванні, запаўняе дайджастамі матэрыялаў, якія падрыхтаваны супрацоўнікамі інфармацыйных агенцтваў: ІТАР-ТАСС, БелТА, Белапан. Гэта цалкам апраўданы падыход, паколькі ўтрыманне ўласных ці спецыяльных карэспандэнтаў для лакальнага выдання, якім з’яўляецца газета “Прамень”, уяўляецца эканамічна немэтазгодным і залішнім.

Неабходна падкрэсліць, што грунтоўны кантэнт-аналіз дазволіў выявіць на старонках газеты беларусаў Латвіі “Прамень” шэраг артыкулаў, якія былі напісаны слыннымі беларускімі вучонымі-філолагамі – Галінай Тычкай і Паўлам Сцяцко, а таксама вядомымі беларускімі журналістамі – Міхасём Шавыркіным, Сяргеем Панізнікам, Інэсай Плескачэўскай. Гэты факт яшчэ раз сведчыць пра вельмі сур’ёзны і ўдумлівы падыход рэдкалегіі выдання да яго жанравага і тэматычнага напаўнення.

Адзначым, што рэдакцыйная калегія газеты “Прамень” пазбаўлена гендарных стэрэатыпаў у рэпрэзентацыі на сваіх старонках вобразаў мужчын і жанчын, што з’яўляецца станоўчай і даволі распаўсюджанай сёння сусветнай тэндэнцыяй. Можна канстатаваць, што у выданні цалкам трымаюцца гендарных падыходаў да рэдакцыйнай падрыхтоўкі медыятэкстаў [7, с. 274–277]. У газеце “Прамень” назіраецца гендарны баланс. Гэта, па-першае, тычыцца раўнавагі паміж аўтарамі мужчынскага і жаночага полаў, па-другое, вызначана парытэтам у полавай прыналежнасці экспертаў, запрошаных да

каментавання пэўных рэалій рэчаіснасці, па-трэцяе, выражаецца ў балансе паміж адлюстраваннем на фотаздымках жаночых і мужчынскіх выяў.

Колькасць палос (старонак), яна якіх месцяцца журналісцкія матэрыялы газеты "Прамень", як выразна дэманструюць вынікі частотна-статыстычнага аналізу, вар'іруецца ад 4 (напрыклад, № 1/1994, № 4/2000, № 1/2010, № 2/2016) да 10 (№№ 4-5/2015). Большасць нумароў у першае дзесяцігоддзе функцыянавання выдання (перыяд з 1994 па 2004 гг.) мела 4 паласы.

Таксама заўважна, што падвоеныя нумары паданалізнага выдання звычайна выходзілі больш як на 4 старонках. На 6 палосах выйшлі наступныя нумары – №№ 3-4/1997, №№ 4-5/2001, №№ 2-3/2001, №№ 10-11/2004, на 8 старонках надрукаваны матэрыялы ў нумарах – №№ 1-2/1998, №№ 3-4/1998, №№ 4-5/2016.

Аднак сярод усіх прааналізаваных нумароў быў шэраг паасобнікаў, якія мелі больш як 4 паласы без пазначэння падваення нумара. На 6 старонках выйшлі наступныя выпускі: № 5/1996, № 6/1998, № 11/1998, № 1/2000, № 3/2015. На 8 палосах надрукаваны № 9/1998. Павелічэнне колькасці старонак у пэўных нумарах газеты "Прамень" у першую чаргу звязана з асвятленнем у іх пэўных, вельмі значных інфармацыйных нагод, што патрабавала павелічэння плошчы выдання. Разам з тым, сярод прааналізаваных выпускаў былі і тыя, што пры падваенні нумара выходзілі на 4 палосах. Напрыклад, №№ 6-7/2002, №№ 8-9/2002, №№ 10-11/2002.

Поўныя звесткі пра колькасць палос у нумарах газеты беларусаў Латвіі "Прамень", прадстаўленых у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (па стане на кастрычнік 2016 г.), прыводзяцца ў Дадатку 3.

Сапраўдную навуковую цікавасць для ўсебаковага аналіза і вывучэння з наступнай інтэрпрэтацыяй атрыманых высноў уяўляе мастацка-тэхнічнае афармленне газеты беларусаў Латвіі "Прамень".

Як паказалі вынікі частотна-статыстычнага аналізу, першае дзесяцігоддзе свайго існавання (перыяд з 1994 па 2004 гг.) выданне выходзіла ў чорна-белым фармаце. Аднак, трэба адзначыць, што фотаздымкі да апублікаваных журналісцкіх матэрыялаў былі выкананы на даволі высокім тэхнічным узроўні, што ў значнай ступені кампенсавала адсутнасць колернасці выяў.

Разам з тым, некаторыя выпускі газеты беларусаў Латвіі "Прамень" мелі каляровае аздабленне асобных старонак. Аднакаляровыя (маецца на ўвазе, надрукаваныя не чорнай фарбай) плашкі, заліўкі, назвы рубрык і ўласна загаловачныя комплексы на першай і апошняй палосах выдання падчас частотна-статыстычнага аналізу і кантэнт-аналізу былі выяўлены ў наступных нумарах газеты: № 5/1996, № 9/1999, № 1/2000, № 3/2000, № 9/2001, № 6/2003, № 6/2005, № 7/2010 і інш. Цалкам каляровымі былі першая і апошняя палосы у наступных з усяго масіву прааналізаваных нумароў (змяшчалі каляровыя выявы, фотаздымкі, малюнкі, плашкі і заліўкі, уласна загаловачныя комплексы): № 11/1998 і № 7/2010. Нумары выдання, пачынаючы з № 1/2011 і № 2/2011, з'яўляюцца ўжо цалкам каляровымі (гл. мал. 1).


ПРАМЕНЬ

“Беларускае Купалле” захапіла сваёй магіяй і прыгажосцю

Малюнак 1. Прыклад вёрсткі і мастацка-тэхнічнага афармлення старонкі газеты “Прамень”.

Пераход рэдакцыйнай калегіі газеты “Прамень” з чорна-белага на двухколерны, а пасля і на каляровы друк, нават з улікам таго, што каляровае аздабленне матэрыялаў выдання павышае выдаткі на яго вытворчасць, можна патлумачыць некалькімі фактарамі, па-першае, жаданнем дагадзіць сваёй чытацкай аўдыторыі, спробамі яе ўтрымання і пашырэння, па-другое, імкненнем да ўзмацнення візуалізацыйных магчымасцяў публікацый, па-трэцяе, наяўнасцю канкурэнцыі з боку нацыянальных латвійскіх друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Такое рашэнне, як паказвае выдавецкая пратыка, можна лічыць мэтазгодным і своечасовым, паколькі адпаведнасць сучасным тэндэнцыям, тэхнічным магчымасцям паліграфічнай вытворчасці і запатрабаванням спажыўцоў з’яўляецца адной з абавязковых умоў поспеху, як камерцыйнага, так і сацыяльнага, для традыцыйнага сродку масавай інфармацыі.

За значны ўклад у развіццё беларускага друку ў замежжы, умацаванне беларуска-латвійскіх культурна-асветніцкіх сувязей рэдакцыя газеты Саюза беларусаў Латвіі «Прамень» 14 кастрычніка 2009 г. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь была ўзнагароджана Ганаровай граматай [гл. 2]. Гэты факт з’яўляецца пазнакай высокай ацэнкі не толькі працы ўсяго калектыву выдання, але і ўвогуле ўсяго Саюза беларусаў Латвіі. Інфармацыю пра гэтую падзею рэдкалегія газеты “Прамень” размяшчае на першай паласе кожнага нумара выдання, побач з яго лагатыпам і назвай (гл. мал. 2).




Малюнак 2. Выява назвы і лагатыпу газеты “Прамень”.

Поўныя звесткі пра наяўнасць альбо адсутнасць каляровага аздаблення ў нумарах газеты беларусаў Латвіі “Прамень”, прадстаўленых у фондах

Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (па стане на кастрычнік 2016 г.), прыводзяцца ў Дадатку 4.

Як паказваюць вынікі праведзенага дыскурснага аналізу тыраж газеты беларусаў Латвіі “Прамень” на працягу 22 гадоў яе выхаду ў свет вагаўся ад 1000 экзэмпляраў (напрыклад, №№ 1-2/3003, № 1/2011, № 2/2011, 4-5/2016) да 5000 (прынамсі № 7/2010) паасобнікаў аднаго нумара. У некаторых нумарах выдання звесткі пра тыраж у выхадных дадзеных увогуле не пазначаліся (напрыклад, № 1/1994, № 6/1995, № 1/1996 – апошні нумар без пазначэння накладу выдання). Даволі працяглы перыяд (з 1995 г. па 2001 г.) газета выходзіла даволі вялікім для падобнага віду выданняў тыражом у 3000 экзэмпляраў (згодга з пазнакамі ў выхадных звестках, напрыклад, № 2/1995, № 12/2001 – апошні нумар з пазначаным тыражом 3000 паасобнікаў). З 2002 г. па 2005 г. тыраж газеты складаў 2000 экзэмпляраў (напрыклад, №№ 2-3/2002, №№ 10-11/2004, №6/2005), за выключэннем нумара №№ 1-3/2003, які выйшаў тыражом 1000 паасобнікаў.

Нумары газеты “Прамень” з 2006 г. па 2009 г. у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адсутнічаюць (гл. Дадатак 1), таму вызначыць тыражнасць выдання ў гэты перыяд мы не змаглі, што пазначана ў табліцы Дадатку 2.

На сёння тыраж газеты беларусаў Латвіі “Прамень” складае 1000 асобнікаў (№№ 4-5/2016). Зніжэнне тыражнасці газеты, на наш погляд, можна патлумачыць у першую чаргу экстралінгвістычнымі фактарамі, якія ўплываюць на выдавецкую дзейнасць і працу рэдакцый сродкаў масавай інфармацыі па ўсім свеце [гл. 18]. Гэта, па-першае, глабальнае развіццё інфармацыйных тэхналогій, па-другое, некантралюемае пашэрэнне аб’ёмаў інфармацыі, якую чытачам прыходзіцца самастойна фільтраваць і абмяжоўваць, па-трэцяе, перавага ў моладзевай аўдыторыі да атрымання неабходнай інфармацыі (у тым ліку і навін, і аналітыкі) праз анлайнавыя крыніцы і электронныя медыя [гл. 19]. Таму працэс зніжэння тыража газеты можна лічыць натуральным і непазбежным. Аднак выпуск 1000 паасобнікаў выдання на патэнцыйную аўдыторыю ў 60 000 – 70 000 спажыўцоў, якімі з’яўляюцца прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Латвіі, уяўляецца мэтазгодным.

Поўныя звесткі пра тыражнасць (колькасць экзэмпляраў і пазначэнне пра адсутнасць маркіроўкі тыража ў выхадных дадзеных) газеты беларусаў Латвіі “Прамень” у нумарах, прадстаўленых у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (па стане на кастрычнік 2016 г.), прыводзяцца ў Дадатку 2.

Для пашырэння аўдыторыі, прыцягненні да выдання новых чытачоў рэдакцыйнай калегіі газеты беларусаў Латвіі “Прамень” можна рэкамендаваць стварыць анлайнавую (сеткавую) версіі выдання, не абмяжоўваючыся размяшчэннем у адпаведным раздзеле сайта Саюза беларусаў Латвіі PDF-файла з вёрсткай чарговага нумара. Гэта можа быць як асобная платформа, так і старонка на сайце Саюза беларусаў Латвіі, дзе матэрыялы самой газеты будуць толькі часткай кантэнту, які можа быць пашыраны за кошт допісаў чытачоў, публікацыі відэа і аўдыё-файлаў і г.д. Такая платформа ў перспектыве можа развіцца ў паўнавартасны анлайнавы сродак масавай інфармацыі і камунікацыі, прыносіць камерцыйны прыбытак за кошт платнага кантэнту, размяшчэння рэкламных блокаў і паведамленняў.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праведзенае даследаванне дазволіла вырашыць шэраг пастаўленых агульных і прыватных задач.

**Па-першае**, было выяўлена, што ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі знаходзяцца далёка не ўсе нумары газеты беларусаў Латвіі "Прамень". Гэтая акалічнасць замінае беларускім медыядаследчыкам працаваць з кантэнтам выдання. На наш погляд, рэдакцыі газеты "Прамень" мэтазгодна было б знайсці магчымасць папоўніць фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі экзэмплярамі адсутных нумароў выдання.

**Па-другое**, зроблена грунтоўнае аналітычнае апісанне кантэнту газеты беларусаў Латвіі "Прамень" на розных гістарычных этапах яго існавання (з 1994 г. па 2016 г.). У паданалізным СМІ, які можна лічыць паўнавартасным грамадска-палітычным выданнем, наяўнічаюць матэрыялаў практычна ўсіх журналісцкіх жанраў: інфармацыйных (нататкі, замалёўкі, інтэрв'ю, справаздачы, агляды, рэпартажы), аналітычных (карэспандэнцыі, артыкулы, рэцэнзіі, агляды), мастацка-публіцыстычных (нарысы, фельетоны).

**Па-трэцяе**, вызначаны і апісаны асаблівыя прыкметы зместу паданалізнага выдання. Выяўлена яскравая і ўстойлівая тэндэнцыя да публікацыі ў газеце "Прамень" матэрыялаў пераважна гісторыка-культурнага зместу. Аднак, разам з тым, у тэматычных прыярытэтах рэдкалегіі газеты на працягу 22 гадоў існавання выдання знаходзяцца і публікацыі, якія тычацца грамадска-палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама ў краіне пражывання чытачоў газеты – у Латвійскай Рэспубліцы. Шматлікія матэрыялы, апублікаваныя ў газеце "Прамень", прысвечаны пытанням афіцыйных узаемаадносін Беларусі і Латвіі.

**Па-чацвёртае**, быў праведзены комплексны аналіз мастацкага афармлення выдання ў перыяд з 1994 г. па 2016 г., які дазволіў вызначыць высокі ўзровень якасці рэдакцыйнай падрыхтоўкі матэрыялаў газеты "Прамень" да друку, а таксама дбайныя адносіны рэдкалегіі СМІ да візуалізацыі кантэнту, імкненне карыстацца найноўшымі магчымасцямі паліграфічнай вытворчасці, а таксама адпавядаць сучасным тэндэнцыям у афармленні традыцыйных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі.

**Па-пятае**, сфармуляваны рэкамендацыі для рэдакцыйнай калегіі газеты беларусаў Латвіі "Прамень" па стварэнні анлайнавай (сеткавай) версіі выдання, дзе PDF-файл з вёрсткай чарговага нумара будзе толькі часткай кантэнту, якае ў перспектыве можа развіцца ў паўнавартасны анлайнавы сродак масавай інфармацыі і камунікацыі, прыносіць прыбытак.

Дадатак 1

Наяўнасць нумароў газеты беларусаў Латвіі “Прамень” у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па стане на кастрычнік 2016 г.

| **Год выдання** | **Нумар выдання** | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **11** | **12** |
| 1994 | | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 1995 | - | | | | | | | | адс. | | | |
| 1996 | | | | | | | | | | | | |
| 1997 | | | | | | | | | | | | |
| 1998 | | | | | | | | | | адс. | | |
| 1999 | | | | | | | | | | | адс. | адс. |
| 2000 | | адс. | | | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | | | адс. |
| 2001 | | | адс. | | | | | | | | | |
| 2002 | адс. | | | адс. | адс. | | | | | | | адс. |
| 2003 | | | | адс. | | | | | | | адс. | адс. |
| 2004 | | | | | адс. | | адс. | | адс. | | | адс. |
| 2005 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2006 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2007 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2008 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2009 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2010 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2011 | | | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2012 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2013 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2014 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2015 | адс. | адс. | | | | | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2016 | | | адс. | | | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | - | - |

Дадатак 2

Тыраж газеты беларусаў Латвіі “Прамень”, пазначаны ў нумарах, прадстаўленых у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, па стане на кастрычнік 2016 г.

<table>
<tr><th rowspan="2">Год выдання</th><th colspan="12">Нумар выдання</th></tr>
<tr><th>1</th><th>2</th><th>3</th><th>4</th><th>5</th><th>6</th><th>7</th><th>8</th><th>9</th><th>10</th><th>11</th><th>12</th></tr>
<tr><td>1994</td><td>не пазн.</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td></tr>
<tr><td>1995</td><td>-</td><td>3000</td><td>не пазн.</td><td>не пазн.</td><td>не пазн.</td><td>не пазн.</td><td>не пазн.</td><td>не пазн.</td><td>адс.</td><td>не пазн.</td><td>не пазн.</td><td>3000</td></tr>
<tr><td>1996</td><td>не пазн.</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td></tr>
<tr><td>1997</td><td>3000</td><td>3000</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td></tr>
<tr><td>1998</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>адс.</td><td>3000</td><td>3000</td></tr>
<tr><td>1999</td><td>3000</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td>3000</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td>3000</td><td>3000</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2000</td><td>3000</td><td>адс.</td><td>3000</td><td>3000</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2001</td><td>3000</td><td>3000</td><td>адс.</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td colspan="2">3000 (спалуч.)</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td><td>3000</td></tr>
<tr><td>2002</td><td>адс.</td><td colspan="2">2000 (спалуч.)</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td colspan="2">2000 (спалуч.)</td><td colspan="2">2000 (спалуч.)</td><td colspan="2">2000 (спалуч.)</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2003</td><td colspan="3">1000 (спалуч.)</td><td>адс.</td><td>2000</td><td>2000</td><td>2000</td><td>2000</td><td colspan="2">2000 (спалуч.)</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2004</td><td>2000</td><td colspan="3">2000 (спалуч.)</td><td>адс.</td><td>2000</td><td>адс.</td><td>2000</td><td>адс.</td><td colspan="2">2000 (спалуч.)</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2005</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>2000</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2006</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2007</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2008</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2009</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2010</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>5000</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2011</td><td>1000</td><td>1000</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2012</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2013</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2014</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2015</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>1000</td><td colspan="2">1000 (спалуч.)</td><td>1000</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2016</td><td>1000</td><td>1000</td><td>адс.</td><td colspan="2">1000 (спалуч.)</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>-</td><td>-</td></tr>
</table>

Дадатак 3

Колькасць палос (старонак) у нумарах газеты беларусаў Латвіі “Прамень”,
прадстаўленых у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі,
па стане на кастрычнік 2016 г.

| **Год выдання** | **Нумар выдання** | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **11** | **12** |
| 1994 | 4 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - |
| 1995 | - | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 | адс. | 4 | 4 | 4 |
| 1996 | 4 | 4 | 4 | 4 | 6 | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 |
| 1997 | 4 | 4 | 6 (спалуч.) | | 4 | 4 | 4 | 4 | 6 (спалуч.) | | 6 (спалуч.) | |
| 1998 | 8 (спалуч.) | | 8 (спалуч.) | | 4 | 6 | 4 | 4 | 8 | адс. | 6 | 4 |
| 1999 | 4 | 6 (спалуч.) | | 4 | 6 (спалуч.) | | 6 (спалуч.) | | 4 | 4 | адс. | адс. |
| 2000 | 6 | адс. | 4 | 4 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | 6 (спалуч.) | | адс. |
| 2001 | 4 | 4 | адс. | 6 (спалуч.) | | 6 (спалуч.) | | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 |
| 2002 | адс. | 6 (спалуч.) | | адс. | адс. | 4 (спалуч.) | | 4 (спалуч.) | | 4 (спалуч.) | | адс. |
| 2003 | 6 (спалуч.) | | | адс. | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 (спалуч.) | | адс. | адс. |
| 2004 | 4 | 4 (спалуч.) | | | адс. | 4 | адс. | 4 | адс. | 6 (спалуч.) | | адс. |
| 2005 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | 4 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2006 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2007 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2008 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2009 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2010 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | 4 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2011 | 4 | 4 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2012 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2013 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2014 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2015 | адс. | адс. | 6 | 10 (спалуч.) | | 6 | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. |
| 2016 | 6 | 4 | адс. | 8 (спалуч.) | | адс. | адс. | адс. | адс. | адс. | - | - |

Дадатак 4

Каляровае аздабленне нумароў газеты беларусаў Латвіі "Прамень", прадстаўленых у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, па стане на кастрычнік 2016 г.

<table>
<tr><th rowspan="2">Год выдання</th><th colspan="12">Нумар выдання</th></tr>
<tr><th>1</th><th>2</th><th>3</th><th>4</th><th>5</th><th>6</th><th>7</th><th>8</th><th>9</th><th>10</th><th>11</th><th>12</th></tr>
<tr><td>1994</td><td>фрагм. 1 с.</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td><td>-</td></tr>
<tr><td>1995</td><td>-</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>адс.</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td></tr>
<tr><td>1996</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>2 кол. 1 і 6 с.</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td></tr>
<tr><td>1997</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td colspan="2">2 кол. 1 і 6 с.</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td></tr>
<tr><td>1998</td><td colspan="2">ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>адс.</td><td>каляр. 1 і 6 с.</td><td>ч/б</td></tr>
<tr><td>1999</td><td>ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td>ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>ч/б</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2000</td><td>2 кол. 1 і 6 с.</td><td>адс.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td colspan="2">ч/б</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2001</td><td>ч/б</td><td>ч/б</td><td>адс.</td><td colspan="2">ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td></tr>
<tr><td>2002</td><td>адс.</td><td colspan="2">ч/б</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td colspan="2">ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td colspan="2">ч/б</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2003</td><td colspan="3">ч/б</td><td>адс.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td colspan="2">2 кол. 1 і 4 с.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2004</td><td>ч/б</td><td colspan="3">2 кол. 1 і 4 с.</td><td>адс.</td><td>ч/б</td><td>адс.</td><td>ч/б</td><td>адс.</td><td colspan="2">2 кол. 1 і 6 с.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2005</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>2 кол. 1 і 4 с.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2006</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2007</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2008</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2009</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2010</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>каляр. 1 і 4 с.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2011</td><td>каляр.</td><td>каляр.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2012</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2013</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2014</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2015</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>каляр.</td><td colspan="2">каляр.</td><td>каляр.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td></tr>
<tr><td>2016</td><td>каляр.</td><td>каляр.</td><td>адс.</td><td colspan="2">каляр.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>адс.</td><td>-</td><td>-</td></tr>
</table>

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Аб Саюзе беларусаў Латвіі // Саюз беларусаў Латвіі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://belorus.lv/?p=2003. – Дата доступу: 27.07.2016.
2. Аб узнагароджанні рэдакцыі газеты Саюза беларусаў Латвіі «Прамень» Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь : Пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 14 кастр. 2009 г., № 1322 // Эталон – Беларусь [Электронны рэсурс] / Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2009.
3. Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе / Склад. Зора і Вітаўт Кіпелі. – Нью-Йорк : Беларускі інстытут навукі і мастацтва, 2003. – 582 с.
4. Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе. – Нью-Йорк : Беларускі інстытут навукі і мастацтва, 2004. – 150 с.
5. Да беларусаў Латвіі // Прамень : газета беларусаў Латвіі. – 1994. – 24 снежня. – С. 1.
6. Ждановіч, І. Душэўны летапіс жыцця / І. Ждановіч // Голас Радзімы. – 2016. – 3 сак. – С. 1–2.
7. Зелянко, С.В. Гендарныя падыходы да рэдакцыйнай падрыхтоўкі медыятэкстаў / С.В. Зелянко // Журналістыка-2015: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 17-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 12–13 ліст. 2015 г., Мінск / рэдкал. : С.В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 17. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 274–277.
8. Іванэ, Г. Беларускай школе ў Рызе – 20 гадоў / Г. Іванэ // Саюз беларусаў Латвіі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://belorus.lv/?p=1170. – Дата доступу : 25.08.2016.
9. Коваль, В.У. Беларускамоўныя перыядычныя выданні дыяспары – важныя гістарычныя крыніцы / В.У. Коваль // Кніжная культура Беларусі : погляд праз стагоддзі : матэрыялы XII міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 7-8 красавіка 2016 г. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [складальнікі: Т.А. Сапега, А.А. Суша]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2016. – 239–242.
10. Косуха, Т. "Спатканне" очаровали Екабпилс / Т. Косуха // Latvijas Radio 4 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : goo.gl/3EaMZh. – Дата доступу : 14.08.2016.
11. Латвія // Вікіпедыя : Свабодная энцыклапедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : goo.gl/odYhNv. – Дата доступу : 27.09.2016.
12. Олесава, І. Газета “Прамень” – летапіс беларускай дыяспары Латвіі / І. Олесава // Саюз беларусаў Латвіі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://belorus.lv/?p=939. – Дата доступу : 18.09.2016.
13. Піскунова, В.А. Этнічнае адраджэнне беларусаў Латвіі ў 1990–2004 гадах і перспектыва іх жыцця ў Латвійскай Рэспубліцы / В. Піскунова // Латвія – Беларусь: дыялог двух культур: матэрыялы І міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Рыга, 4 снежня 2004 г. / Рыжскае Латышскае

таварыства ; [складальнікі: В.А. Піскунова, Т.Ф. Бучэль, Л.Р. Шакавец]. – Рыга : Саюз беларусаў Латвіі, 2004. – С. 109–114.

14. Прамень / Саюз беларусаў Латвіі. – Рыга : Беларускае таварыства “Прамень”, 2008. – 96 с.

15. Стральцоў, Б.В. Метад і жанр. Асновы творчага майстэрства журналіста / Б.В. Стральцоў. – Мінск : БДУ, 2002. – 118 с.

16. Шакавец, Л. Газеце беларусаў Латвіі – 20 гадоў! / Л. Шакавец // Саюз беларусаў Латвіі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://belorus.lv/?p=942. – Дата доступу : 18.09.2016.

17. Шакавец, Л. Роля сродкаў масавай інфармацыі ў развіцці беларускай культуры ў Латвіі / Л. Шакавец // Латвія – Беларусь: дыялог двух культур: матэрыялы І міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Рыга, 4 снежня 2004 г. / Рыжскае Латышскае таварыства ; [складальнікі: В.А. Піскунова, Т.Ф. Бучэль, Л.Р. Шакавец]. – Рыга : Саюз беларусаў Латвіі, 2004. – С. 107–108.

18. Barthel, M. Newspapers: Fact Sheet / M. Barthel // Pew Research Center: Journalism & Media [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.journalism.org/2016/06/15/newspapers-fact-sheet/. – Date of access : 18.10.2016.

19. Henriksson, T. Full highlights of World Press Trends 2016 survey / T. Henriksson // World Association of Newspapers and News Publishers [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.wan-ifra.org/articles/2016/06/12/full-highlights-of-world-press-trends-2016-survey. – Date of access : 18.10.2016.

20. Kipel, V. Belarusian publishing in the West / V. Kipel, Z. Kipel. – New York : Belarusian Institute of Arts and Sciences ; Warsaw : Polish Academy of Sciences, Institute of Slavic Studies, 2006. – 841 p.

21. McMillin, A. Belarusian literature of the diaspora / A. McMillin. – Birmingham : Centre for Russ. and East Europ. Studies, 2002. – 503 p.